Дзяржаўная установа адукацыі
“Сярэдняя школа №15 г. Ліды”
Бібліятэка

# У мовы роднай – роднае карэнне



Да Міжнароднага дня роднай мовы

***Дыялектная мова багацейшая за літаратурную***

Слоўнік літаратурнай беларускай мовы налічвае прыкладна 250 000—500 000 слоў. У дыялектнай мове (агульная назва для гаворак людзей у пэўным рэгіёне) — каля 1,5–2 мільёны слоў.

***У беларускай мове тры алфавіты (графічныя сістэмы)***

На сённяшні дзень афіцыйна ўжываецца **кірылічны алфавіт**, які існуе з XIV ст. У XVI ст. з’явілася лацінка. Ёй пісаліся творы беларускай літаратуры XIX ст. На пачатку XX ст. кірылічны і лацінскі алфавіты суіснавалі разам. Так пэўны час газета «Наша ніва» друкавала тэксты на дзвюх графічных сістэмах, каб усе беларусы разумелі напісанае, таму што каталікі звыклі да лацінкі, а праваслаўныя разумелі толькі кірыліцу.

Зараз лацінка ўжываецца ў тапаніміцы — назвах геаграфічных аб’ектаў. Таксама ёй карыстаюцца ў побытавых зносінах беларусы, якія лічаць лацінку больш зручнай сістэмай для перадачы асаблівасцяў беларускага маўлення.

Дарэчы, у 2007-м годзе Міжнародны камітэт ААН зацвердзіў беларускую лацінку для афіцыйнага ўжытку ў тапаніміцы

З XIV ст. на Беларусі пачалі сяліцца татары, якія трапілі ў палон падчас набегаў Арды. Паступова яны асіміляваліся, і ў выніку з’явіліся кітабы — кнігі, напісаныя па-беларуску **арабскай вяззю**.

***Беларуская мова існуе ў двух правапісах***

У 1918-м годзе мовазнаўца і грамадска-палітычны дзеяч Браніслаў Тарашкевіч выдаў «Беларускую граматыку для школ» кірыліцай і лацінкай. Гэта была першая практычная граматыка. Канешне, былі ў яе і пэўныя недахопы, якія дапрацоўваў у сваёй граматыцы Язэп Лёсік. Распрацаваны ім правапіс называецца класічным, або **«тарашкевіцай»**.

З 1933-га года ў выніку разгортвання русіфікацыі замацавалася так званая **«наркамаўка»**. Гэты правапіс

рэфармаваўся двойчы: у 1956-м годзе і ў 2008-м. Апошнім варыянтам мы карыстаемся сёння.
Тарашкевіца vs наркамаўка.

***<u>Толькі ў беларускай мове ёсць літара Ў</u>***

Гэта адметнасць беларускай мовы ўвасоблена ў помніку, які знаходзіцца ў Полацку. Над скульптурай працаваў мастак і дызайнер Ігар Куржалаў. У нізе помніка выбітыя радкі з верша народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна: «Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет».

Помнік усталяваны ў 2003-м годзе.

***<u>Беларуская мова знаходзіцца пад пагрозай знікнення</u>***

У паўсядзённых зносінах ёй карыстаецца малы працэнт насельніцтва. Толькі ⅔ беларусаў размаўляе на роднай мове ў побыце. Часцей беларуская мова ўжываецца на дзяржаўных тэле- і радыёканалах, у перыядычных выданнях, справаводстве. Актыўна выкарыстоўвае беларускую мову творчая і навуковая інтэлігенцыя Беларусі.

***<u>Тры стагоддзі беларуская мова была дзяржаўнай у ВКЛ</u>***

З XIV ст. і да 1696 года беларуская мова была афіцыйнай мовай Вялікага Княства Літоўскага. Пасля аб’яднання ВКЛ і Каралеўства Польскага ў 1569-м годзе пачалася паланізацыя насельніцтва Княства. Скончылася гэта поўным выцясненнем беларускай мовы з афіцыйнага ўжытку. З 1696-га года справаводства Рэчы Паспалітай было пераведзена на польскую мову. З таго часу беларуская мова ўжывалася ў побыце.

***<u>Не па-беларуску і не па-руску, а на трасянцы</u>***

Сумесь беларускай і рускай мовы называецца «трасянка». У прамым сэнсе яно абазначае сена нізкай якасці, якое ўтвараецца ад спалучэння сухой і свежаскошанай травы. Ва ўкраінскай мове таксама ёсць падобная з’ява і называецца яна «суржык».

***Для беларускай мовы не характэрны дзеепрыметнікі цяперашняга часу***

Дзеепрыметнікі цяперашняга часу (сплючы чалавек, маючыя дадзеныя) — чужынцы ў беларускай мове. Яны ўжываюцца толькі ва ўстойлівых спалучэннях (бягучы год, дзеючая асоба), характэрных для навуковага і афіцыйнага стыляў. У іншых выпадках гэта парушэнне літаратурнай мовы.

Дзеепрыметнікі найбольш распаўсюджаныя ў рускай мове, бо паходзяць з царкоўнаславянскай мовы, на глебе якой і развівалася сучасная літаратурная руская мова. У старабеларускай мове такія формы дзеяслова не былі распаўсюджаныя.

***Некалі беларуская мова мела статус адзінай дзяржаўнай мовы ў Беларусі***

У 1990-м годзе быў прыняты закон «Аб мовах», згодна з якім беларуская мова прызнавалася адзінай дзяржаўнай мовай незалежнай Рэспублікі Беларусь. Але пасля рэферэндуму 1995-га года статус дзяржаўнай набыла і руская мова. Дарэчы, прапанову ўрада вярнуць рускай мове статус дзяржаўнай падтрымала большасць беларусаў. Мяркуецца, насельніцтву было цяжка пасля савецкіх часоў адразу перайсці на беларускую мову ва ўсіх сферах зносін. Людзі элементарна яе не ведалі. Зараз, як бачым, прыярытэт у зносінах мы аддаём рускай мове.

***У беларускім алфавіце 32 літары***

Наш алфавіт не мае літар Щ, Ъ. Замест цвёрдага знака мы ўжываем апостраф (‘). Дыграфы ДЗ і ДЖ не ўваходзяць у алфавіт, бо гэта спалучэнне дзвюх літар для абазначэння адпаведных гукаў.

***Падборка выказванняў пра родную мову як беларусаў, так і замежнікаў падрыхтаваная спецыяльна да Дня роднай мовы.***

## БЕЛАРУСКІЯ ДЗЕЯЧЫ ПРА РОДНУЮ МОВУ

- Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову. **(Я.Колас)**
- Роднае слова – гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет. **(Я.Колас)**
- Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю. **(Я.Колас)**
- Кожны народ мае свой гонар. Англічанін перад усім светам горда вызначае: я – англічанін! Тое самае скажа француз, немец, аўстрыец, рускі і іншыя прадстаўнікі другіх нацый. А мы, беларусы, не адважываемся празнацца ў тым, што мы – беларусы. Бо на галаву беларускага народа, як вядома, многа выліта памыяў, годнасць яго прыніжана і мова яго асмеяна, у яго няма імя, няма твару. **(Я.Колас)**
- Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам. **(Я.Сіпакоў)**
- Мова – гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ. **(І.Мележ)**
- Не саромся, беларус, гаманіць па-свойму – на роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх. Шануй сваю мову, шануй свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае – гэта спадчына дзядоў і вялікі нацыянальны скарб. Толькі тады цябе ўсе будуць шанаваць як чалавека, калі сам сябе будзеш шанаваць – калі не адкінеш свайго нацыянальнага ўласнага багацця. А першы скарб нацыянальны – гэта родная мова. **(З.Бядуля)**
- Хто не шануе родную мову, той не шануе сябе самога, ні свой род, ні сваіх дзядоў-бацькоў, якія той жа мовай гаварылі. **(В.Ластоўскі)**
- Хто саромеецца роднай мовы, варты таго, каб і яго добрыя людзі саромеліся. **(В.Ластоўскі)**

- Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю. **(Ф.Багушэвіч)**
- Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш сваю мову, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займае, пасля зусім замерлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі. **(Ф.Багушэвіч)**
- Ігнараваць мову – гэта значыць ігнараваць народ, нацыю. **(П.Пестрак)**
- Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў. **(Ф.Скарына)**
- Хто адрокся мовы бацькоў сваіх, хто ўдзеў чужую апратку – той адышоў ад народу далёка-далёка. Ён чужы ў роднай вёсцы, у сваёй сям'і. І на яго браты глядзяць як на чужынца. **(Цётка)**
- Родная мова, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць. **(Цётка)**
- Родная мова, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць. **(Цётка)**
- Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны творы, і гэты твор – мова. **(А.Разанаў)**
- Незвычайнае хараство і зладжанасць чуецца нам у гучанні роднага слова. **(А.Крывіцкі)**
- Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў. **(У.Караткевіч)**
- Мова, прыгожае пісьменства, паэзія, музыка – сродак сувязі між душамі людзей, вышэйшы сродак. **(У.Караткевіч)**
- Выбірай: быць пасрэднасцю на мове суседа або нечым значным на сваёй. **(У.Караткевіч)**
- Беларусь-католік, ці беларусь-праваслаўны павінны то помніць, што ў іх адна Бацькаўшчына – Беларусь, адна мова родная – беларуская, адны звычаі і абычаі, адвеку перадаваныя з пакалення ў пакаленне. **(Я.Купала)**
- Хто не разумее роднай мовы, той не павінен займаць урадавай пасады на Беларусі. **(Я.Купала)**

- Там, дзе не шануюць роднай мовы, мялеюць рэкі, нішчацца дубровы, народ той мёртвы, а той край нямы. **(Г.Бураўкін)**
- Што ў цябе ёсць, акрамя мовы, з якой складаюцца твае думкі і словы? **(В.Марціновіч)**
- Мова – гэта этыка.Гэта наша спрадвечнае разуменне таго, што ёсць дабро і што ёсць зло, зашыфраванае ў словах. **(В.Марціновіч)**
- Сёння для нас важней за ўсё – мова, на першым плане павінна быць мова. Будзе мова – будзе нацыянальная свядомасць і будзе Беларусь. Ня будзе мовы – ня будзе Беларусі. **(Ніл Гілевіч)**
- Без усведамлення, што такое мова ў жыцці народа, што такое нацыянальная культура, нацыянальная гісторыя, у народа не можа быць будучыні. **(Н.Гілевіч)**
- Паміраньне мовы такая ж натуральная зьява, як і нараджэньне яе. Быць можа, што і мая мова некалі памрэ. Як памру я сам, чалавек. І я аніяк не баюся натуральнай сьмерці. А от калі насільна паміраць – страшна. **(Я.Скрыган)**
- Нам мова далася крывёю. **(А.Сыс)**
- Існуе няпісаны (і неабвержны) закон, які цудоўна ведаюць усе па-сапраўднаму адукаваныя і культурныя людзі: чым лепей ведаеш нейкую мову (і гэта можна сказаць не толькі пра мову, але і пра краіну, навуку, сяброў, многіх жанчын, мастацтва і г.д.) – тым больш яна прыгожая і значная. **(У.Караткевіч)**
- Мова – аснова ня толькі нацыянальнай культуры, але і існаваньня нацыі, існаваньня этнасу. **(В.Быкаў)**
- Беларуская мова – нашая галоўная сакральная каштоўнасць. Усё найлепшае, што было створанае на гэтай зямлі, створанае на беларускай – ад Бібліі Скарыны да Статута ВКЛ. І яна гэтай каштоўнасцю будзе заставацца, нават калі знікне. **(В.Акудовіч)**
- Бог размаўляе з табой на тваёй роднай мове. **(Л.Дайнека)**
- Сёння ў Беларусі расейская мова — гэта тэрыторыя ўлады, а беларуская — тэрыторыя свабоды. **(В.Акудовіч)**

- Ва ўсім свеце чалавек, размаўляючы на роднай мове, проста размаўляе. У нас зусім інакш. Кожны раз, калі на людзях мы прамаўляем па-беларуску, дык не проста сумовімся, а як бы ладзім грамадзянскую акцыю ці мастацкі перформанс, паколькі ўвага ўсіх, хто выпадкова апынуўся побач, адразу засяроджваецца на нечаканым дзіве. **(В.Акудовіч)**
- Мова — той азонавы слой, які дазваляе больш-менш устойліва функцыянаваць, развівацца і нарошчваць свой патэнцыял усім астатнім чыннікам культуры нават у неспрыяльных для яе ўмовах. **(В.Акудовіч)**
- Мова — гэта код, які адкрывае дзьверы ў тую або іншую культурную прастору. А культура — гэта пераемнасьць, спадчына, традыцыя, алюзія. **(С.Абламейка)**

**ЗАМЕЖНЫЯ ДЗЕЯЧЫ ПРА РОДНУЮ МОВУ**

- Мова не можа быць дрэннай, або добрай ... Бо мова – гэта толькі люстэрка. Тое самае люстэрка, на якое нельга наракаць. **(С.Даўлатаў)**
- Мова падобны на надтрэснуты кацёл, на якім мы выстукваем мелодыі, якія гучаць так, як быццам яны прызначаныя для танцаў мядзведзя, між тым як мы б хацелі прысвяціць іх зорам. **(Г.Флабер)**
- Усе найгалоўныя замежныя мовы можна вывучыць за шэсць гадоў, але для вывучэння сваёй недастаткова и цэлага жыцця. **(Вальтэр)**
- Мова, якой мы карыстаемся, уплывае на наша мысленне ... **(Б.Вебер)**
- Калі мова чалавека млявая, цяжкая, нямоглая, нявызначаная, вельмі адукаваная, то такі, напэўна, і розум гэтага чалавека. **(І.Гердэр)**
- Найвялікшая багацце народа – яго мова! Тысячагоддзямі назапашваюцца і вечна жывуць у слове незлічоныя скарбы чалавечай думкі і вопыту. **(М.Шолахаў)**
- Народ выяўляе сябе ў мове сваёй. Народ дзейнічае; яго дзейнасцю кіруе розум; розум і дзейнасць народа адлюстроўваюцца ў мове яго. **(І.Сразнеўскі)**

- Неўміручасць народа – у яго мове. **(Ч.Айтматаў)**
- ...Нездарма шматпакутныя народы, пераносячы самыя страшныя ўдары лёсу, не могуць толькі перанесці пагібелі роднага слова... **(Н.Катлярэўскі)**
- Кожная мова мае свой словарух, сваю гармонію, і дзіўна было б рускаму ці італьянцу, або ангельцу пісаць для французскага вуха і наадварот. **(К.Бацюшкаў)**
- Што ні кажы, а родная мова заўсёды застаецца роднай. Калі хочаш гаварыць па душы, ніводнага французскага слова ў галаву не ідзе, а калі хочаш бліснуць, тады іншая справа. **(Л.Талсты)**
- Мова – вопратка думак. **(С.Джонсан)**
- Мова народа – лепшы колер усяго яго духоўнага жыцця, які ніколі не вяне і вечна зноў распраўляецца. **(К.Ушынскі)**
- Прырода краіны і гісторыя народа, адлюстроўваючыся ў душы чалавека, выяўляліся ў слове. Чалавек знікаў, але слова, ім створанае, заставалася несмяротнай і невычэрпнай скарбніцай народнай мовы; так што кожнае слова мовы, кожная яго форма ёсць вынік думак і пачуццяў чалавека, праз якія адбілася ў слове прырода краіны і гісторыя народа. **(К.Ушынскі)**
- Стварыць мову немагчыма, бо яе стварае народ; філолагі толькі адкрываюць яе законы і прыводзяць іх у сістэму, а пісьменнікі толькі твораць на ёй адпаведна з гэтымі законамі. **(В.Бялінскі)**
- Хто не ведае замежных моў, той нічога не ведае і пра сваю мову. **(І.Гётэ)**
- Розніца паміж мовамі настолькі вялікая, што адзін і той жа выраз здаецца грубым ў адной мове і ўзнёслым у іншай. **(Д.Драйдэн)**
- Мова ёсць люстэрка думак народа; разумовы склад кожнай расы адліваецца, як стэрэатып, у яе мову, выбіваецца на ёй, як медаль. **(Х.Сехадор)**
- Мова – гэта шлях цывілізацыі і культуры. **(А.Купрын)**
- Мова народа заўсёды найцяснейшым чынам звязаны з нацыянальным духам. **(В.Гумбальдт)**

- Сапраўдная любоў да сваёй краіны немагчыма без любві да роднай мовы. **(К.Паустоўскі)**
- Галоўны урок цывілізацыі – трэба жыць са сваёй мовай. **(Н.Назарбаеў)**
- Мы павінны зразумець, што пакуль самі не будзем размаўляць на сваёй роднай мове, ніхто іншы па-сапраўднаму не будзе паважаць гэтую мову. **(Н.Назарбаеў)**
- Мова ёсць найбольш каштоўны скарб народа, першы сродак яго развіцця і заклад ўсіх духоўных поспехаў, галоўнае права на славу ў нашчадкаў. **(М.Пагодзін)**
- Нападаць на мову народа, значыцца нападаць на яго сэрца. **(Г.Лаубе)**
- Чалавек, які не ведае народны побыт, мову, характар, не можа быць лідэрам. **(А.Байтурсынулы)**
- Нацыянальнасць народа, які размаўляе на сваёй мове, які піша на сваёй мове, ніколі не знікне. Самы магутны фактар, які спрыяе захаванню або знікненню нацыі, гэта – мова. Разам са знікненнем мовы знікае і сам народ. Тыя, хто хоча далучыць да сваёй нацыі іншы народ, перш за ўсё імкнуцца да знішчэння мовы гэтага народу. **(А.Байтурсынулы)**
- Калі ёсць магчымасць захаваць мову, то яе трэба захаваць. Наколькі здолеем захаваць сваю мову, настолькі мы захаваем і сваю нацыю. **(Г.Кіраш)**
- Калі ведаеш добра родную мову і прыстойна размаўляеш і на іншай мове, то гэта цудоўна; калі ж робіш гэта, не ведаючы роднай мовы, то гэта – трагедыя. Не ведаючы сваю мову, пераймаць чужую – недаравальная памылка. **(Х.Досмухамедулы)**
- Мова народа – скарб, які захоўвае, перадае з пакалення ў пакаленне эпохі, перажытыя гэтым народам, яго светапогляды, кругагляд, мары, радасці і спадзяванні, словам, усе хвалюючыя яго душу моманты. **(Ж.Аймауытулы)**
- Нацыя, пазбаўленая мовы, не можа доўга быць нацыяй на гэтым свеце. Такая нацыя асуджана. Першая ўмова жыццяздольнасці нацыі – наяўнасць мовы. Аслабленне

мовы нацыі кажа аб пачатку яе знікнення. Для нацыі нічога не можа быць даражэй за яе мову. У мове народа як у люстэрку знаходзяць адлюстраванне менталітэт, гісторыя, побыт, характар гэтай нацыі. **(М.Жумабаев)**

- Таго, хто не паважае, не шануе родную мову, сваю літаратуру, нельга лічыць адукаваным, культурным чалавекам. **(М.Ауэзаў)**
- Трэба жыць, прымаючы вопыт суседа, а не яго мову. **(Т.Абдыкулы)**
- Калі ты размаўляеш з чалавекам на той мове, якую ён разумее, ты размаўляеш з яго галавой. Калі ты размаўляеш з чалавекам на яго роднай мове, ты размаўляеш з яго сэрцам. **(Н.Мандэла)**